■ Бяры прыклад

# КАБ КНІГА СТАЛА МАГНІТАМ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Сацыяльны праект «Чытаем па-беларуску з Velcom» з удзелам вядомых беларускіх пісьменнікаў стартаваў у школах.**




На працягу трох месяцаў больш чым у 30 школах Мінска, а таксама ў 2 школах для дзяцей з асаблівасцямі развіцця пройдуць урокі па спецыяльна распрацаванай праграме. Вучні другіх і трэціх класаў будуць не толькі знаёміцца з сучаснай беларускай літаратурай, але і атрымаюць практычныя лінгвістычныя навыкі.

Ініцыятарам праекта выступіла кампанія Velcom пры падтрымцы Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама. Ролю педагогаў возьмуць на сябе дзіцячы пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка», лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Уладзімір Ліпскі, пісьменніца, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Раіса Баравікова, пісьменніца-казачніца Алена Масла, паэтка і публіцыстка Таццяна Сівец, а таксама вядомы беларускі акцёр і тэлевядучы Юрый Жыгамонт.

— Вельмі важна, што звяртацца да дзіцячай аўдыторыі будуць самі вядомыя літаратары, якія прадставяць маленькім чытачам свае творы. Спадзяёмся, што гэтыя ўрокі стануць добрым дадаткам да школьнай праграмы і яркай падзеяй для кожнага маленькага ўдзельніка, — расказаў **начальнік аддзела карпаратыўных камунікацый кампаніі Velcom Вячаслаў СМІРНОЎ.**

— Гэты праект блізкі маёй душы, майму сэрцу і маёй сутнасці, — падкрэслівае **пісьменнік Уладзімір ЛІПСКІ,** — таму што мова — гэта душа чалавека. Чалавек не можа быць паўнавартасным, калі яго душа не мае пэўных мускулаў. А мова, чытанне, літаратура — гэта і ёсць мускулы душы. Сёння моладзь захоплена інтэрнэтам. Але мы, дарослыя, павінны зрабіць усё, каб кніга стала для дзяцей магнітам. Я ўдзячны ініцыятарам гэтага праекта. Давайце ўкладваць грошы ў развіццё роднай Беларусі і дзяцей — галоўнага нашага скарбу!

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# ЗА БЯСПЕКУ РАЗАМ

## Сёння ў краіне пачынаецца адпаведная акцыя

**Большасць пажараў, на якіх гінуць людзі, адбываецца ў халодны час года. Адбываюцца ўсе яны з-за чалавечага фактару: адны няправільна эксплуатуюць печ, другія перагружаюць электрасетку, трэція кураць у ложку...**

— Гэтае прафілактычнае мерапрыемства стала ўжо традыцыйным напярэдадні пажаранебяспечнага сезона. Паколькі яно мае комплексны характар, мы падключаем для дапамогі прадстаўнікоў іншых міністэрстваў: унутраных спраў, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, працы і сацыяльнай абароны, інфармацыі, энергетыкі ды адукацыі, — паведаміў **начальнік аддзела арганізацыі прафілактычнай працы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Руслан ЛІХАМАНАЎ.**

Акцэнт робіцца на катэгорыю грамадзян так званай групы рызыкі. Гэта ў першую чаргу тыя, хто жыве адзін. Здараецца так, што пэўныя работы па бяспечнай эксплуатацыі тых жа печаў яны самі выканаць не могуць: камусьці проста няма каго паклікаць на дапамогу, або пытанне ўпіраецца ў грашовы складнік. Прыйдзе спецыяльная камісія і ў сем'і, у якіх дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Але самая праблемная група — гэта людзі, якія злоўжываюць «зялёным змеем» і стаяць на ўліку ў органах унутраных спраў. Менавіта па іх віне і адбываецца большасць пажараў у краіне. Больш за тое, на ўшчуванні яны часта рэагуюць неадэкватна.

— Паўдзельнічаць у акцыі можа кожны жыхар краіны, — працягвае Руслан Ліхаманаў. — Дастаткова толькі ўстанавіць у сябе аўтаномны пажарны апавяшчальнік, калі вы гэтага яшчэ не зрабілі. А калі ён у вас ужо ёсць, то прасачыце, каб працаваў. Справа, як бачыце, зусім не хітрая...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Спорт-тайм

# БАТЭ ЗНОЎ ЧЭМПІЁН!

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» расказвае пра датэрміновае чэмпіёнства барысаўскай каманды ў першынстве краіны, пройгрышы «Цмокаў» пасля дзвюх перамог у Адзінай лізе ВТБ і другую вікторыю гандбольнага СКА ў Кубку ЕГФ.**

**1. Футбалісты барысаўскага БАТЭ за тры туры да фінішу 25-га чэмпіянату краіны сталі недасяжальнымі для сапернікаў,** такім чынам, забяспечыўшы сабе залатыя медалі. На выездзе яны выйгралі ў «Віцебска» з лікам 2:0. Героем сустрэчы стаў Дзмітрый Мазалеўскі, які аддаў галявы пас і паразіў вароты саперніка пасля працяглага перапынку, выкліканага траўмай. Гэта ўжо 12-ы па ліку і 10-ы запар чэмпіёнскі тытул для барысаўчан.

— Эмоцыі толькі станоўчыя. Шчаслівы ад таго, што затрачаныя намаганні прыносяць вынікі, — падзяліўся **галоўны трэнер БАТЭ Аляксандр ЕРМАКОВІЧ** пасля матча. — Чакалі складанай гульні: у гэтым чэмпіянаце ў нас не было лёгкіх сустрэч. «Віцебск» добра праводзіць апошнія матчы. У першым тайме ўдала забілі, не без фарту. Што тычыцца складу, то ставілі наймацнейшых. Гулялі на перамогу, гэта важна для нас.

Нагадаем, сёння барысаўскі клуб у рамках Лігі чэмпіёнаў прымае на сваёй арэне «Барселону».

**2. Хакейнае мінскае «Дынама» на старце чатырохматчавага далёкаўсходняга турнэ абыграла лідара Усходняй канферэнцыі «Сібір» з лікам 3:2.** Гэта дазволіла беларусам зарабіць 2 балы, таму што перамога была здабыта толькі ў авертайме. Нагадаем, дынамаўцы праводзілі першы матч пасля нечаканага сыходу з пасады галоўнага трэнера Любаміра Покавіча. Прычыны застаюцца невядомымі; слабак пасняшайся пакінуць Беларусь і не стаў раскрываць прычыны канфлікту. Заўтра «зубры» згуляюць з хабараўскім «Амурам», а 23 кастрычніка — з «Адміралам» з Уладзівастока.

**3. У выхадныя стартаваў чэмпіянат краіны па баскетболе сярод жаночых камандаў.** Сёлета ён упершыню носіць фармат адкрытага першынства Беларусі. Першай замежнай камандай, якая прымае ў ім удзел, стала смаленская «Камея».

— Мы вельмі рады, што чэмпіянат у гэтым годзе выйшаў за межы краіны: для нас гэта крок наперад, таму што, калі мы варымся ў сваёй «кашы» — гэта адно, а калі мы бачым баскетбол трошкі іншы, то нея к різлічваем свае сілы, бачым іншую баскетбольную школу, — адзначыў **старшыня беларускай федэрацыі баскетбола Максім РЫЖАНКОЎ.**

У цяперашнім чэмпіянаце краіны прымаюць удзел 10 камандаў; плануецца, што ўсе матчы будуць трансляваца ў рэжыме анлайн.

**4. Мінскі гандбольны СКА паўторна перамог галандскі «Фолендам» (32:30) і выйшаў у 3-ці раўнд Кубка ЕГФ.** Свайго новага саперніка армейцы даведаюцца на лёсаванні ў Вене, якое пройдзе сёння.

— Мы задаволеныя вынікам. Перавага, здабытая ў гасцях, разняволіла хлопцаў. Тым не менш каманда хацела перамагчы на хатняй пляцоўцы, а не проста аформіць выхад у наступны раўнд. На жаль, думка пра гасцявых «плюс сем» не дала гульцам цалкам праявіць сябе. Думалі, раз там выйгралі сем, значыць, тут выйграем восем. Але ў галандцаў моцная каманда, з якой трэба гуляць на максімуме і ў гасцях, і дома. У нас узніклі вялікія праблемы ў абароне, не пайшла гульня ў варатароў. Але я рады, што каманда справілася са складанай сітуацыяй і ўзяла верх, — адзначыў **галоўны трэнер СКА Спартак МІРАНОВІЧ.**

**5. Баскетбалісты «Цмокі-Мінск» пасля дзвюх перамог пацярпелі першае паражэнне ў новым сезоне Адзінай лігі ВТБ.**

На пляцоўцы комплексу «Мінск-Арэна» каманда Ігара Грышчука ўпэўнена кантралявала ход гульні з «Зенітам» з Санкт-Пецярбурга. Перад вялікім перапынкам мінчане былі наперадзе з лікам 41:37, але ў трэцяй чвэрці гаспадары страцілі кантроль і набралі толькі 8 ачкоў супраць 20 у сапернікаў. Менавіта гэты правал і не дазволіў «драконам» дамагчыся поспеху — лік сустрэчы 71:79.

Свой наступны паядынак у турніры баскетбалісты «Цмокі-Мінск» праведуць 22 кастрычніка ў гасцях у рыжскага ВЭФа. У чатырох папярэдніх сустрэчах латвійская каманда атрымала адну перамогу і тройчы саступала сапернікам.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Гарадскія тапонімы

# ЯК ПРАЙСЦІ НА ВУЛІЦУ ПТАШУКА?

## Зусім хутка такое пытанне можна будзе пачуць у сталіцы

**Імем вядомага кінарэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, народнага артыста Беларусі Міхаіла Пташука назавуць вуліцу Праектаваную №4 у мінскім мікрараёне Лошыца.**




Апроч гэтага, у сталіцы з'явяцца вуліцы Віктара Турава і Юрава-Завальная. Такое рашэнне было прынята на сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў. Паводле яго, Праектаванай вуліцы №2 у мікрараёне Лошыца прысвояць імя вядомага кінарэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, народнага артыста БССР і СССР Віктара Турава.

Як падкрэсліла **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама Віталіна РУДЗІКАВА,** Віктар Тураў і Міхаіл Пташук унеслі значны ўклад у станаўленне і развіццё беларускага кінамастацтва, жылі і працавалі ў Мінску.

«Неаднаразова прадстаўнікі творчых саюзаў і Міністэрства культуры звярталіся з просьбай увекавечыць імёны гэтых вядомых дзеячаў культуры», — адзначыла яна.

Таксама на сесіі Мінгарсавета прынята рашэнне вярнуць гістарычную назву «вуліца Юрава-Завальная» безназоўнаму праезду ад вул. Ракаўскай да вул. Раманаўская Слабада. На думку членаў камісіі па найменні і перайменаванні праспектаў, вуліц, плошчаў і іншых складовых частак Мінска, прысваенне наймення праезду будзе спрыяць вывучэнню гісторыі сталіцы. А паколькі горад працягвае будавацца, то вуліц хопіць для ўвекавечання многіх выдатных беларускіх дзеячаў. І тут актыўнасць і пажаданні грамадскасці нярэдка маюць ключавое значэнне.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*

ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ

## ЗВАНЫ САФІІ — У ГОНАР БАХА

**У «калысцы гарадоў беларускіх» — старажытным Полацку — 20-ты раз праходзіць міжнародны фестываль арганнай музыкі «Званы Сафіі».**



— Сёлета ён прысвечаны 30-й гадавіне аргана канцэртнай залы славутага Сафійскага сабора... У фэсце бяруць удзел арганісты з Даніі, Францыі, Беларусі і іншых краін. Апошні канцэрт, які адбудзецца 22 лістапада, прысвечаны 330-й гадавіне з дня нараджэння Баха, — паведамілі «Звяздзе» ў Полацкім райвыканкаме.

Гэты ўнікальны фестываль добра ведаюць ва ўсёй Еўропе. Полацкая арганістка Ксенія Пагарэлая на ім прадставіць праграму, якую бліскуча выканала ў Францыі. Нядаўна яна першай з беларускіх арганістаў сыграла ў саборы Парыжскай Божай Маці.

Арганізатары пастараліся, каб кошт квіткоў быў даступным: 120 тысяч рублёў. Заўсёды шмат ахвочых атрымаць асалоду ад праслухоўвання шэдэўраў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

## СМЯРОТНАЕ ПОЛЫМЯ

**Позна ўвечары ў нядзелю сталічны праспект Пераможцаў напоўніўся гукамі сірэн пажарных аўтамабіляў. Яны імчаліся ў прыватны сектар блізу вадасховішча Дразды.**

— Паведамленне аб пажары ў нежылым доме на завулку Веснінка паступіла на пульт дзяжурнага ў 21.43, — паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — Калі пажарныя разлікі прыбылі на месца падзей, высветлілася, што дом гарыць адкрытым полымем, пашкоджаны дах і перакрыцці. Веранду ж агонь знішчыў цалкам.

Пажар удалося патушыць толькі ў 22.17. Прычына ўзгарання пакуль невядомая. Але пры дэмантажы пашкоджаных канструкцый ратаўнікі знайшлі тры абгарэлыя чалавечыя целы. Чые менавіта жыцці забраў пажар у Веснінцы, пакуль невядома.

Усяго ж ад пачатку года па краіне адбылося 4911 пажараў, у якіх загінула 415 чалавек.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*